Пацвярджэннем таму быў і пачатак перыяду восеньскіх вяселляў.

*Літ.:* Л о з к а А.Ю. Беларускі народны каляндар. Мн., 1993; Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 2. Жыцця адвечны лад. Мн., 1998. С. 515.

*У. А. Васілевіч.*

**БАЎТРАМЕЙ**, В а р ф а л а м е й, прысвятак у *народным календары.* Адзначалі 25 жніўня с.ст. (7 верасня н.ст.). Па яго надвор'і вызначалі характар усёй восені. Імя святога Б., рыфмуючыся з адпаведнымі аграрнымі работамі, давала падказку селяніну пачынаць сяўбу азімых: «Прыйшоў Баўтрамей — жыта на зіму сей». Менш надакучлівымі станавіліся насякомыя, што тлумачылася тым, быццам святы Б. душыць аваднёў і мух. У гэты ж дзень мог адбыцца адлёт буслоў у вырай. Іх вяртанне, а потым і з'яўленне птушанят, прыблізна праз 9 месяцаў, падмацоўвала тлумачэнне, што дзяцей прыносяць менавіта гэтыя птушкі: «Святы Баўтрамей высылае буслоў па дзяцей».

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ